Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

**Рэзалюцыя**

Канферэнцыі Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства “Грамадзянская супольнасць Беларусі: выклікі застою і адзяржаўлення трэцяга сектара”, г. Мінск, 25 чэрвеня 2015 года

Мы, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства вітаем агульны працэс узнаўлення дыялогу Беларусі з Еўрапейскім саюзам. У тым ліку:

- перамовы беларускага ўраду і Еўрапейскага саюза па магчымай праграме мадэрнізацыі для Беларусі ў фармаце “прамежкавай фазы” двухбаковых адносінаў. Мы адзначаем важнасць як мага больш хуткага адкрыцця еўрапейска-беларускага Дыялогу па Правах Чалавека, прадугледжанага Дэкларацыяй Рыжскага Саміта Усходняга партнерства;
- прагрэс у перамовах па спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі. Мы заклікаем бакі прыкласці ўсе магчымыя намаганні, каб зняць апошнія перашкоды да падпісання пагаднення;
- прыняцце Беларусі ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі. Заклікаем беларускія ўлады да належнага, канструктыўнага, адкрытага і інклюзіўнага працэссу рэалізацыі дарожнай мапы рэформаў вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі Балонскай сістэмы.
- ініцыятыву Рэспублікі Беларусь па ўсталяванні Панэлі па гарманізацыі лічбавых рынкаў. Мы падкрэсліваем неабходнасць следвання прынцыпам Хартыі пра Адкрытыя Дадзеныя, таксама як і забеспячэння агульнай свабоды цыркуляцыі інфармацыі ў краіне.

У той жа час мы вымушаныя канстатаваць адсутнасць фактычнага прагрэсу ў галіне правоў чалавека, належнага кіравання, дэмакратыі і спрыяльных ўмоваў для дзейнасці грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. У краіне за кратамі застаюцца палітычныя вязні Мікалай Статкевіч, Мікалай Дзядок, Ігар Аліневіч, Яўгені Васьковіч, Арцем Пракапенка, Юры Рубцоў. У апошнія месяцы пашырылася практыка ціску на палітычных вязняў. Па сведчаннях беларускіх праваабаронцаў стаў больш жорсткім рэжым утрымання ў дачыненні да палітвязня Мікалая Статкевіча; да новага тэрміна пазбаўлення волі на два года быў прысуджаны палітвязень Юры Рубцоў; палітвязні Ігар Аліневіч і Мікалай Дзядок падвяргаліся ціску ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар.

Працягваецца практыка абмежавання свабоды слова, ціску на незалежныя медыі і пераследу незалежных журналістаў і дэмакратычных актывістаў. У краіне адсутнічаюць належныя ўмовы для рэалізацыі свабоды ассацыяцыяў, грамадзянская супольнасць выключана з працэсу дыялогу з уладамі па найбольш вострых пытаннях рэалізацыі правоў чалавека, належнага кіравання і дэмакратыі.

Мы чарговы раз вымушаны адзначаць адсутнасць неабходных палітычных і прававых умоваў для правядзення свабодных і дэмакратычных выбараў. Мы заклікаем прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнай апазіцыі адмовіцца ад ўдзелу ў чарговай электаральнай маніпуляцыі.

Мы па-ранейшаму занепакоеныя сітуацыяй непрыкрытай вайсковай агрэсіі Расіі супраць Украіны, а таксама незаконнай анексіяй Расійскай Федэрацыяй часткі ўкраінскай тэрыторыі – Крыму. Мы лічым, што пазіцыя беларускіх уладаў адносна гэтага пытання ня ёсць канструктыўнай і падрывае сяброўскія адносіны паміж народамі Украіны і Беларусі.

Мы падкрэсліваем, што праблемы ў галіне правоў чалавека, належнага кіравання, дэмакратыі і спрыяльных ўмоваў для дзейнасці грамадзянскай супольнасці застаюцца галоўнымі перашкодамі для еўрапеізацыі Беларусі. Мы заклікаем беларускія ўлады, структуры ЕС, краіны ЕС, прадстаўнікоў беларускай грамадзянскай супольнасці да сумесных намаганняў у вырашэнні гэтых ключавых праблемаў.